*В. Ю. Дылеўская (Рэспубліка Беларусь, Мінск,*
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт)*

# ЗАКЛЮЧНЫЯ ЗАНЯТКІ Ў СІСТЭМЕ РАБОТЫ НАД ЛІТАРАТУРНЫМ ТВОРАМ

Пошук метадычных знаходак у правядзенні заключных заняткаў як аднаго з этапаў вывучэння мастацкага твора з'яўляецца актуальным і цікавым. Студэнты часта атаясамляюць заключныя заняткі з паўтарэннем. На гэтым этапе нельга паўтараць папярэдні ход разбору твора, тут патрабуецца актыўная і напружаная дзейнасць. Патрэбна зноў асэнсаваць вывучанае, каб у вучняў не склалася ўражанне развітання з творам. Заключныя заняткі маюць на мэце не толькі падвядзенне вынікаў, не толькі фарміраванне абагульненняў і вывадаў. “Заключныя заняткі арыентуюць вучняў на ўзнаўленне цэласнасці твора, на давядзенне чытацкага ўспрымання да глыбокага спалучэння вобразных і паняційных элементаў мыслення. Заключныя заняткі заўсёды нясуць у сабе элемент навізны і засяроджвання на самым галоўным” [1, с. 86].

На пратычных занятках па методыцы выкладання славянскіх літаратур студэнты атрымалі заданне прапанаваць некалькі варыянтаў правядзення заключных заняткаў на матэрыяле аднаго з мастацкіх твораў, якія вывучаюцца ў 5-11 класах (тэма – на выбар студэнта). Патрэбна дакладна вызначыць віды дзейнасці настаўніка і вучняў, уключыць пытанні і заданні, якія дазволяць асэнсаваць праблематыку вывучанай тэмы на новым, абагульняючым узроўні. Былі падрыхтаваны паведамленні (пасля агляду публікацый па праблеме): “Які метадычны патэнцыял заключных заняткаў?”, “Метадычныя знаходкі ў правядзенні заключных заняткаў”, “Спецыфіка, перавагі і недахопы заключных заняткаў”. Перад мадэляваннем канспекта ўрока правядзення заключнага ўрока яны пазнаёміліся з працамі метадыстаў па выкарыстанні розных форм, метадаў і сродкаў кантролю на ўроках вывучэння літаратуры. Нельга не пагадзіцца з выказваннем вучонага-метадыста У. Г. Маранцмана: “Заключныя заняткі павінны ствараць адчуванне глыбіні і невычарпальнасці твора” [2].

Адзначаецца, што на заключным этапе вывучэння мастацкага твора мэтазгодна прадставіць вынікі самастойнай дзейнасці, якая ажыццяўляецца ў рамках этапа аналізу твора з мэтай паглыбіць і абагульніць веды вучняў. Таксама прадугледжваецца інтэрпрэтацыйная дзейнасць вучняў па біяграфічным матэрыяле, мастацкім тэксце. Можна прапанаваць распрацаваць віртуальную экскурсію па старонках жыцця і творчасці пісьменніка або падабраць матэрыял для фактычнай экскурсіі. З мэтай кантролю ступені засваення вывучанага матэрыялу прапануецца напісанне сачынення. Мэтазгодна звяртацца да сумежных відаў мастацтва: актыўна выкарыстоўваць разгляд ілюстрацый да твора, рэпрадукцый карцін

мастакоў, фотаздымкаў з наступным абмеркаваннем. Рэкамендуецца ўлічваць рода-жанравую спецыфіку вывучаемага твора. Так, напрыклад, пры вывучэнні эпічных твораў можна прапанаваць заданні творчага і даследчага характару, параўнанне розных ацэнак крытыкаў, напісанне казкі і інш. На заключных занятках па вывучэнні драматычных твораў дарэчы выкарыстанне прыёму інсцэніравання, прагляд і абмеркаванне тэатральных пастановак (можна фрагментаў у відэазапісе), супастаўлення розных рэжысёрскіх трактовак, акцёрскага ўвасаблення. Літаратурна-музычная кампазіцыя, конкурс чытальнікаў выкарыстоўваюць на заключным этапе па вывучэнні лірычных твораў.

Студэнты павінны ўсвядоміць, што ў асноўныя задачы заключных заняткаў уваходзіць: падвядзенне вынікаў, падрыхтоўка да творчай работы, фарміраванне абагульненняў і вывадаў. “Змест заключных заняткаў і методыка іх правядзення ввызначаюцца: 1) адукацыйнымі мэтамі, якія ставяцца пры вывучэнні дадзенай тэмы; 2) рода-жанравай спецыфікай вывучаемага твора; 3) узроставымі асаблівасцямі навучэнцаў; 4) інтэлектуальным фонам класа і інш.” [3, с. 124].

А. В. Руцкая адзначае: “У залежнасці ад структуры вылучаюць абагульняючыя, праблемныя, паглыбленыя (накіраваныя на больш поўнае разуменне характараў герояў, мастацкай адметнасці твора, яго ролі ў літаратурным працэсе) заключныя заняткі. Змест заключных заняткаў, выбар метадычных прыёмаў і формаў правядзення залежыць ад іх тэматыкі, характару матэрыялу, акрэсленай настаўнікам структуры” [4, с.103]. Абагульнячыя заняткі раіцца праводзіць у форме конкурсаў, віктарын, франтальнай рабоце з класам па пытаннях, тэставых заданняў. Праблемныя заключныя заняткі праводзяцца ў форме гутаркі, дыскусіі, актыўна выкарыстоўваецца параўнанне. Выкарыстанне сумежных відаў мастацтва, мемуарных, заснаваных на сведчаннях сучаснікаў пісьменіка, дзённікавых запісаў часцей выкарыстоўваецца на заключных занятках паглыбленага тыпу.

Напрыклад, можна прапанаваць тэставыя заданні па творчасці Янкі Купалы :

1. Творчасцю якіх пісьменнікаў асабліва цікавіўся Янка Купала?
2. Якія творы Янка Купала напісаў у Акопах?
3. У якіх вершах Янкі купалы гучыць ідэя свабоды Радзімы?
4. У якіх вершах гучыць адзін з галоўных матываў лірыкі Янкі Купалы – сцвярджэнне чалавечай годнасці беларуса?
5. Якія вершы Янкі Купалы прасякнуты глыбокім пачуццём любові да Радзімы?
6. У якіх ранніх рамантычных паэмах Янкі Купалы гучаць патрыятычныя матывы?
7. Які твор з’яўляўся першай драматычнай паэмай Янкі Купалы?

Заключныя заняткі па вывуэнні мастацкага твора павінны выклікаць у вучняў патрэбнасць ізноў звярнуцца да твора, па-новаму асэнсаваць яго, каб не ўзнікла ілюзіі развітання з творчасцю пісьменніка.

***Літаратура***


1. Богданова, О. Ю. Методика преподавания литературы: учеб. для студ. пед. вузов / О. Ю. Богданова, С. А. Леонов, В. Ф. Чертов; под ред. О. Ю. Богдановой. – М.: Изд. центр «Академия», 2002.
2. Методика преподавания литературы: учебник для пед. вузов / под ред. О. Ю. Богдановой, В. Г. Маранцмана. В 2 ч. – Ч. 1. – М., 1994.
3. Методика обучения литературе: практикум / Г. В. Пранцова, Е. С. Романичева. – М.: ФЛИНТА: Наука, 2012.
4. Методыка выкладання беларускай літаратуры : вучэб. дапам. / А. В. Руцкая, М. У. Грынько. – Мінск, 2010.